Спорт-тайм

Кароткая вада аказалася хуткая

У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра поспехі беларусаў на чэмпіянаце Еўропы па плаванні і іншыя прыкметныя падзеі выхадных.

1. Анастасія Шкурдай заваявала залатую ўзнагароду на дыстанцыі 100 м батэрфляем на чэмпіянаце Еўропы па плаванні на кароткай вадзе, які праходзіць у Глазга (Вялікабрытанія). Брастаўчанка фінішавала за 56,21 сек. Раней беларус Ілья Шымановіч заваяваў сярэбраны медаль на дыстанцыі 100 м брасам. А пазней беларуская мужчынская каманда ў складзе Віктара Стасяловіча, Ілы Шымановіча, Яўгена Цуркіна і Арцёма Мачэкіна заняла трэцяе месца ў камбінаванай эстафеце 4х50 м.

Адзначым, што чэмпіянат Еўропы на кароткай вадзе з'яўляецца адборачным да сусветнага форуму — 2020.

Адзначым, на чэмпіянаце Еўропы ў Лісабоне разыгрываліся 13 камплектаў узнагарод: па шэсць у індывідуальным і камандным заліках, а таксама ў змешанай эстафеце. У турніры ўдзельнічала каля 600 бегуноў з 40 краін Еўропы.

2. Беларусы Кацярына Карняенка, Арцём Калачоў, Вольга Немагай і Сяргей Платонаў выйгралі «серабро» ў змешанай эстафеце 4х1,5 км на чэмпіянаце Еўропы па кросе ў партугальскім Лісабоне. Апярэдзіць беларускі эстафетны квартэт змагла толькі каманда Вялікабрытаніі, замкнулі тройку французскія спартсмены.

3. Юнацкія зборныя Беларусі (U-16) сталі пераможцамі баскетбольнага турніру памяці Уладзіміра Рыжанкова. У спаборніцтвах сярод дзяўчат беларускі ў заключным матчы абыгралі каманду Польшчы — 80:53. Нагадаем, да гэтага яны ўпэўнена перамаглі аднагодак з Літвы (67:43) і Малдовы (123:26).

На мужчынскім турніры зборная Беларусі ў апошняй сустрэчы перайграла каманду з расійскага Краснагорска — 102:29. А раней нашы хлопцы абыгралі літоўцаў (74:73) і малдаўскіх баскетбалістаў (67:31).

Найлепшымі гульцамі турніру прызнаныя беларусы Паліна Касцюкавец і Цімур Міхайлаў. Міжнародны турнір памяці першага міністра спорту і турызму, першага кіраўніка НАК Беларусі Уладзіміра Рыжанкова прайшоў 23-ы раз.

4. Футбалісты брэсцкага «Руху» ўпершыню заваявалі права згуляць у вышэйшай лізе чэмпіянату Беларусі, адолеўшы ў пераходных матчах магілёўскі «Дняпро».

Нагадаем, у сезоне, які завяршыўся, чэмпіёнам краіны ўпершыню стала брэсцкае «Дынама», якое спыніла гегемонію 15-разовага трыумфатара барысаўскага БАТЭ. Гэтым разам барысаўчане заваявалі сярэбраныя медалі, уладальнікам «бронзы» стаў салігорскі «Шахцёр». Элітны дывізіён акрамя «Дняпра» пакінулі футбалісты «Гомеля», а таксама сталічнае «Тарпеда», якое сышло з турнірнай дыстанцыі. Іх месцы ў наступным сезоне зоймуць дзве найлепшыя каманды 1-й лігі — бабруйская «Белшына» і «Смалявічы».

5. Беларускі Марына Зуева, Яўгенія Вараб'ёва, Ганна Ніфонтава і Ганна Кавалёва занялі пятае месца ў камандной гонцы праследавання ў дывізіёне А на этапе Кубка свету па канькабежным спорце, які завяршыўся ў Нур-Султане.

Першынствавалі ў гэтым відзе праграмы канадкі.

Раней Марына Зуева заняла 14-е месца на этапе Кубка свету па канькабежным спорце на дыстанцыі 1500 метраў сярод жанчын у дывізіёне А.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

Даты Падзеі Людзі

10 СНЕЖНЯ

У краіне

1574 год — нарадзіўся Мікалай Лянчыцкі, дзеяч беларускай культуры першай паловы XVII стагоддзя, прафесар Віленскага ўніверсітэта. Выкладаў у навучальных установах Польшчы, Літвы і Чэхіі. Займаючы высокія пасады ў адміністрацыі каталіцкай царквы, выступаў як прыхільнік рэлігійнай памяркоўнасці, змагаўся за аб'яднанне навучальных устаноў розных канфесій. Памёр у 1653 годзе.



1852 год — нарадзіўся Вандалін Аляксандравіч Шукевіч, беларускі археолаг, антраполаг, краязнавец, член-карэспандэнт Кракаўскай акадэміі навук. Першы з беларускіх археолагаў раскапаў 16 курганоў і 376 каменных магіл тыпу жальнікаў XIII-XIV стагоддзяў і пачаў рабіць хімічныя аналізы старажытных знаходак. Вывучаў эвалюцыю абраду пахавання ад старажытнасці да часоў Вялікага Княства Літоўскага. Аўтар работ, прысвечаных археалагічным знаходкам і раскопкам, а таксама гісторыі і прыродзе Беларусі і Літвы. Памёр у 1919 годзе.

1939 год — нарадзіўся Анатоль Яўхімавіч Белы, беларускі грамадска-культурны дзеяч, калекцыянер. У 1967 годзе скончыў БДУ, выкладаў у ім. Сабраў вялікую калекцыю твораў жывапісу, графікі, медальернага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Ініцыятар і арганізатар устанаўлення помніка Максіму Багдановічу ў Яраслаўлі ў 1994 годзе. Памёр у 2011 годзе.

У свеце

1819 год — нарадзіўся Эдуард Алфрэд Каўпер, англійскі інжынер, вынаходнік. Запатэнтаваў кола са сталёвымі спіцамі і гумовымі шынамі, пішучы электрамагнітны тэлеграф. Памёр у 1893 годзе.

1901 год — адбылося першае прысуджэнне Нобелеўскай прэміі. Яе лаўрэатамі сталі фізік Вільгельм Конрад Рэнтген, хімік Якаб Хендрык Вант-Гоф, мікрабіёлаг Эміль Адольф фон Берынг, пісьменнік Сюлі-Прудом. Нобелеўскую прэмію міру атрымалі адразу два лаўрэаты — заснавальнікі Чырвонага Крыжа швейцарац Жан Анры Дзюнан і француз Фрэдэрык Пасі.

1964 год — нарадзілася Таісія Мікалаеўна Павалій, украінская спявачка, народная артыстка Украіны (1997), народная артыстка Інгушэціі (2012).

1974 год — быў створаны Еўрапейскі Савет — найвышэйшы палітычны орган Еўрапейскага саюза.

1984 год — на 39-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН прынята Канвенцыя супраць катаванняў і іншых жорсткіх, бесчалавечных ці прыніжаючых годнасць відаў абыходжання і пакарання. Увайшла ў сілу 26 чэрвеня 1987 года.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.16	16.48	7.32
Віцебск —	9.13	16.30	7.17
Магілёў —	9.07	16.38	7.31
Гомель —	8.55	16.43	7.48
Гродна —	9.30	17.04	7.34
Брэст —	9.23	17.13	7.50

Месяц

Першая квадра
4 снежня.
Месяц у сузор'і Блізнят.

Імяніны

Пр. *Аляксея, Барыса, Івана, Мікалая, Рамана, Сяргея, Якава.*
К. *Марыі, Юліі, Андрэя, Рыгора.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Вагі дома патрэбныя для таго, каб з гасцямі абмеркаваць, хто і калі ў трэнажорную залу збіраецца.

— Тата, пойдзем пагуляем у футбол!

— Сынок, у нашай краіне футбола няма. Трэба казаць: «Пойдзем пагуляем у мяч».

Шукаць сабе пару — гэта як шукаць месца для паркоўкі. Ты праязджаеш міма першага, бо думаеш, што знойдзеш сабе лепшае. Не знаходзіш. Вяртаешся і бачыш, што першае ўжо занятае.

Яна і ён.

— Дарагі, скажы, я тоўстая?

— Вядома, не. Але я правільна разумею, што скандал усё роўна будзе?..



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае міністэрствам інфармацыі рэспублікі беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 4265.

Нумар падпісаны ў 19.30 9 снежня 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12